# Славутыя сыны зямлі беларускай



Янка Купала і Якуб Колас - гэтыя імёны ў нашым уяўленні заўсёды побач.



Янка Купала і Якуб Колас - гэта сапраўдны пачатак усіх пачаткаў у беларускай культуры, літаратуры і мастацтве.

Яны данеслі каларыт беларускай ментальнасці, унікальныя нацыянальныя вобразы да жыхароў многіх краін свету.

# Янка Купала



Янка Купала (літаратурны псеўданім Івана Дамінікавіча Луцэвіча) нарадзіўся 7 ліпеня 1882 года ў фальварку Вязынка (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобласці).

Паэт нарадзіўся ў купальскую ноч, і гэтая акалічнасць прынесла яму літаратурны псеўданім.

Паходзіў паэт з сям'і дробнага, беззямельнага шляхціча.

У 1898 годзе Я.Купала закончыў народнае вучылішча ў сяле Бяларучы. Далей ён займаўся самаадукацыяй, шмат чытаў.









Янка Купала выступіў у літаратуры ў 1905 годзе на хвалі грамадска-палітычнага і нацыянальнага ўздыму. Яго творчасць была выклікана да жыцця ростам нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. Дзве найвялікшыя гістарычныя падзеі пачатку XX стагоддзя - рэвалюцыя і нацыянальна-вызваленчы рух - узбагацілі яго духоўна, маральна, дапамаглі ўсвядоміць сваё месца і ролю ў літаратуры.

15 мая 1905 года ў прагрэсіўнай рускай газеце "Северо-Западный край" з'явіўся верш Янкі Купалы "Мужык".

*Што я мужык, усе тут знаюць,*
*І, як ёсць гэты свет вялік,*
*З мяне смяюцца, пагарджаюць, -*
*Бо я мужык, дурны мужык.*
*Але хоць колькі жыць тут буду,*
*Як будзе век мой тут вялік,*
*Ніколі, браткі, не забуду,*
*Што чалавек я, хоць мужык.*

У 1906 -1907 гадах напісаны паэмы «Зімою», «Нікому», «Адплата каханнем» . У 1908 годзе «Наша Ніва» друкуе паэму «У Піліпаўку». У гэтым жа годзе кончана праца над паэмай «За што?».



1908 год асабліва памятны ў жыцці паэта, выйшла першая кніга яго паэзіі "Жалейка". У гэтым жа годзе Янка Купала пераехаў у Вільню і пачаў працаваць бібліятэкарам у прыватнай бібліятэцы Даніловіча "Веды" і адначасова ў газеце "Наша ніва".

Там жа пазнаёміўся з будучай жонкаю— Уладзіславай Станкевіч.





Ў 1909 годзе ён паступіў у Пецярбург на агульнаадукацыйныя курсы А. Чарняева. Чатыры гады жыцця і вучобы ў тагачаснай сталіцы Расіі, яе палітычным, культурным і навуковым цэнтры, духоўна ўзбагацілі Янку Купалу, пашырылі яго кругагляд.



У 1910 годзе выйшаў другі зборнік вершаў - "Гусляр".

У гэты час, апрача шматлікіх вершаў, былі напісаны паэмы:  "Сон на кургане", "Курган", "Бандароўна", "Магіла льва", "Яна і я", "Адвечная песня", п'есы: "Паўлінка“ і "Раскіданае гняздо".





У жніўні 1912 года адбылася сустрэча Янкі Купалы з Якубам Коласам на хутары Смольня, на радзіме Коласа. Гэтая сустрэча стала знакавай. Сяброўства двух вялікіх паэтаў працягвалася ўсё жыццё.







У 1913 годзе ў Пецярбургу быў выдадзены трэці паэтычны зборнік Купалы  - "Шляхам жыцця".

Пасля заканчэння вучобы ў Пецярбургу Янка Купала ў кастрычніку 1913 года вярнуўся ў Вільню, якая тады была асяродкам беларускага літаратурна-грамадскага руху. Тут выходзіла газета, працавалі беларускія пісьменнікі.  З першых дзён паэт горача ўзяўся за працу: спачатку ў беларускім выдавецтве, а пасля ў "Нашай ніве"; у сакавіку 1914 года ён стаў рэдактарам гэтай газеты.




НАША НІВА

У Вільні Янка Купала працаваў напружана, з вялікім уздымам. Хутка пачалася імперыялістычная вайна, і ў жніўні 1915 года "Наша ніва" была закрыта.



Мой вечар.

Мой вечар, [illegible], блізка, недалёка —
Ёсць раніца, павінен й вечар быць, —
Але не [illegible] я с-пад долі века —
Дзень, вечар, ноч я [illegible], трэба жыць.

Зямлі і сонцу нізка пакланюся —
Я сын зямлі і сонца вольны сын;
Як з братам, з ветрам шчыра абыймуся —
Я — ветру, вецер мне ліш друг адзін.

Сум вечны пасаджу свой на пасадзе —
Як заслужаны даўно ў мяне на трон;
Ўзлажу карону с слёз яму ў парадзе —
Така карона ўсіх важней карон.

Слугой яму прызначу адзіноту —
Яна сама вернейша с слуг, — без здрад;
Асвятлю харам дум сваіх, яснотай —
Дум шмат я маю, ох, як шмат, як шмат!

Душы дам волю с песняй [illegible] —
Душа і песня — свет мой, скарбы ўсе мае, —
Хай раніца [illegible] майго [illegible],
Хай вечар мне [illegible] ноч дасне!

Янка Купала

4/II—15.

З набліжэннем фронту Янка Купала эвакуіраваўся ў Маскву.

У студзені 1919 года пераехаў у Мінск. Пасля вызвалення Беларусі ад белапольскай акупацыі пачаўся новы перыяд літаратурнай і грамадска-культурнай дзейнасці Янкі Купалы. Паэт, як і раней, жыў інтарэсамі Радзімы.



Працаваў бібліятэкарам у створаным Камісарыятам асветы Народным доме, членам Беларускай навукова-тэрміналагічнай камісіі, загадчыкам літаратурна-мастацкай секцыі літаратурна-навуковага аддзела Наркамасветы; у 1922 годзе стаў разам з Якубам Коласам заснавальнікам і членам Інстытута беларускай культуры, у 1929 годзе быў абраны акадэмікам Акадэміі навук Беларусі і акадэмікам Акадэміі навук Украіны.  У 1925 годзе ў сувязі з 20-годдзем літаратурнай дзейнасці,  Янку Купалу было прысвоена ганаровае званне  Народнага паэта.

У 30-я гады XX стагоддзя паэзія Янкі Купалы ўзбагацілася новымі творамі: выйшлі зборнікі вершаў "Песня будаўніцтву", "Беларусі ардэнаноснай", "Ад сэрца“,  былі напісаны паэмы "Над ракой Арэсай", "Барысаў", "Тарасова доля".

Купала - прызнаны нацыянальны драматург.

Яго камедыя "Паўлінка", якая была напісана ў 1912 годзе і пастаўлена Беларускім музычна-драматычным гуртком у Вільні ў 1913 годзе, як твор класічнай беларускай драматургіі не сыходзіць са сцэны да гэтага часу.



Купала аўтар драмы "Раскіданае гняздо", надрукаванай ў 1913 годзе, сцэнічнага жарту "Прымакі", сатырычнай камедыі "Тутэйшыя".






С пачаткам Вялікай Айчыннай вайны, у чэрвені 1941 года Янка Купала быў вымушаны пакінуць Мінск. Жыў паэт спачатку ў Маскве, потым на Волзе, у пасёлку Пячышчы каля Казані.



18 чэрвеня 1942 года прыехаў у Маскву, быў запрошаны выступіць па радыё.

28 чэрвеня 1942 года Янкі Купалы не стала, трагічная смерць абарвала жыццё паэта.



Янка Купала ўвайшоў у гісторыю сусветнай мастацкай літаратуры як паэт-патрыёт, гуманіст, носьбіт нацыянальнай ментальнасці. Яго паэзія ўвабрала ў сябе лепшыя здабыткі жывой беларускай культуры, мовы, мыслення; яна раскрыла і ўвасобіла характар беларускай нацыі, яе цярпімасць, любоў да роднай зямлі і разам з тым - рамантызм, прагу да ўсяго новага, несакрушальную веру ў лепшае і чалавека.



# Якуб Колас



Нарадзіўся Якуб Колас 3 лістапада (22 кастрычніка па старым стылі) 1882 года ў вёсцы Акінчыцы на Стаўбцоўшчыне ў сям'і лесніка. Сапраўднае імя паэта – Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.




Раннія дзіцячыя гады прайшлі ў лесніковых сядзібах Ласток і Альбуць, што недалёка ад вёскі Мікалаеўшчына.

У 1898 годзе паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якую паспяхова скончыў у 1902 годзе.



Наша сяло, люди и што
робитца въ сялѣ.
— Не! ни пайду я въ карчму! Што за ка-
рысць? Есць яки нищасны грошъ, и той
пратрацишь и часъ звавишь да и галава
буде на заўтра балѣць цэлы день.
Праўда, типерь зима, есць часъ. А у
карчму пазбираютца мужчины, до-
зратъ и паслухаць. Але, сказаць на праў-
ду, чого тамъ слухаць? Сварки! шлёпцы,
якъ бьютца? Не, ни пайду! Чортъ ее
съ карчмою! Алешъ и такъ ни сядзець за-
сложивши руки — маркотна! А якъ
нима чаго робиць, чаго ни прийде въ гала-
ву! Страхъ! Думаешь чортъ знае
што! Треба што-нибудь придумаць,
што-нибудь зробиць, а лишь кабъ и ўдачна
и подъ добра.
Вотъ што пришло мнѣ нынѣ въ
галаву: купиць паперу, а типерь
адинакъ паперъ тонньс, ды зати-

-70-

…ста К. Міцкевіча (Я. Коласа) "Наша сяло, людзі і што робіцца на сяле". 1901-1902 гг.



Настаўнічаў у вёсках: Люсіна Ганцавіцкага раёну (1902 - 1904 гг.), Пінкавічы Пінскага раёну (1904 - 1906 гг.). У гады Першай сусветнай вайны быў мабілізаваны ў армію.

Да 1921 года настаўнічаў у Расіі. У гэтым жа годзе вярнуўся ў Беларусь.



Я. Колас з жонкай і сынам Данілам у перыяд службы прапаршчыкам ў запасным палку. г. Перм. 1917 г.



Сэсія Акадэміі навук 1942 г. Казань.

У Вялікую Айчынную вайну Якуб Колас жыў у Клязьме (пад Масквой), Ташкенце (жнівень 1941 г. - лістапад 1943 г.), Маскве, займаўся творчай і навукова-грамадскай дзейнасцю.



У снежні 1944 года Колас  вярнуўся ў Мінск. Быў сябрам ЦВК БССР (1929 -1931 гг., 1935 - 1938 гг.), дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР (1946 - 1956 гг.) і БССР (1938 - 1956 г.), з'яўляўся старшынёй Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру. Акадэмік Акадэміі навук БССР. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР з 1934 года.



Якуб Колас працаваў выкладчыкам у Белдзяржуніверсітэце.

З дня ўтварэння Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

(1 студзеня 1929 г.) быў яе нязменным віцэ-прэзідэнтам.





Якуб Колас, будучы ўжо знакамітым, ездзіў па гарадах нашай Беларусі і выступаў з лекцыямі на настаўніцкіх курсах. Да гэтага часу не страціла сваёй каштоўнасці напісаная ім першая "Методыка роднай мовы".

Першыя літаратурныя спробы адносяцца да часу навучання ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. У друку дэбютаваў напісаным па-беларуску вершам "Наш родны край" (1906 г., газета "Наша доля"). Тут упершыню быў выкарыстаны псеўданім Якуб Колас.


НАША ДОЛЯ

У сяло Ухтому зъявилася 16 стражникоу, увод салдатоу, урядники—усе пад камандаю исправника. Начальства заехала да хаты старасты, тут сабралися и крэсцьянства, каторых начальство пачало намауляць, каб плацили падатки. Але гэта ничого не памагло—крэсцьяне заявили, што плациць ничого ня будуць.

(Своб. Слово).

**У Владзимирской** губэрни крэсцяне на многих месцох пастанауляюць ня шиць казёной гарэлки. У некаторых месцох разбиваюць манапольки.

(Своб. Слово).

## Авечы агитатор

Скрыпяць шубеницы, на астрогах духота, у Сыбиры нема месца!—И не дзивота!.. Бо кали пригледзишся да усихъ „унутрэных ворогоу“ правицельства, то ня тольки горка слеза занячецца на вачах, але часта и колька стане у боку ад чыстаго смеху.

Прымерам таки вораг: у Калужской губерни у Жыздрынском павеци недалека вёски пасьвилася быдла. Настау вечэр—пара ужо гнаць скацину да хаты. Пастух, замахнуушися пугаю, закрычау: „Ну, скацинка, падымайся, ад старых парадкоу адрэкайся!“—и заграу на дуды „марсыльянку“.

Як раз у той час мимо ехау з казаками прыстау Лавров и Стой!“—закрычау строги прыстау на сваю дружыну. „Арыштоваць агитатора!“.

Кинулися тут да пастуха казаки, ухапили яго, беднаго, и пацягнули у астрог.

Вотъ вам и „унутрэны ворагъ“, вотъ агитатор серад бараних и валовых печеняу! Убояуся мусиць пристау, каб не пашоу рэволюцыйны розрух памеж авечак и целятъ вёсковых!

Бедны пастушок—скруцяць цябе у барани рог ды пашлюць куды у Сыбир. А не бярыся бунтаваць авечак: кали свине спяць, нехай спяць и авечки!..

## Наш родны край.

Край наш бедны, край наш родны!
Грась, балота ды пясок.
Чуць дзѣ троху луг пригодны...
Хвойник, мох ды верасок.
...
А туманы, як пяленка,
Засцилаюць лес и гай...
Ой ты, бедная старонка!
Ой, забыты Багам край!
Наше поле кепска родзиць;
Бѣдна тут жыве народ.
У грязи ен, бедны, ходзиць;
А працуе—льецца пот
Пазираюць нудна вески.
Глянешь—сэрца забалиць.
На дворэ—паленья, щепки;
Куча сметнику ляжиць.
Крыж хваевы пры дарози;
Кучка тополеу сухих...
Сцишина, нудна, як у вастрози,
Як на могилках якiх.
А як песня паняесцца,—
Кольки у песни той нуды!
Уцякау бы, бег, здаецца,
Сам ня ведаешь куды.
Край наш родны Бедна поля!
Ты глядзишь, як сирота.
Нудна ты, як наша доля,
Як ты, наша цемнята!

*Якуб Кол...*

## Ад Редакціи.

*Просим вельмиповажаемых чытаце... бачиць нам, што перши нумэр «Нашей... ня здолели выдаць так, як таго хацели... больш прыкра нам, што нима у ём н... зямельной гаспадарки. У других нумэ... таго браку ужо ня будзе. Просим пис... нас, писаць аба усём што дзеецца, а... дах своих и радосьцях, хто як умее... патребна будзе каму якая парада—... цеся—адкажэмо. Ведайце добра што... Доля» газэта вясковых людзёу.*

*Прысылаючи грошы просим писаць ... данное «Нашое Доли» присылаць: ци ... ваное рускими литэрами ци польскими...*

*Хто хочэ палучаць газэту просим ... шыць з прысылкою грошу. Нумэр други... шое Доли» з прычын од рэдакціи неза... выйдзець 14 сенцябра.*

Рэдактор-выдауца **Иван Тукер...**

1906 год, у «Нашай долі» пад псеўданімам Дзядзька Карусь змешчана апавяданне «Слабода» пра самавольства царскай паліцыі — першы надрукаваны празаічны твор пісьменніка. У той жа час ён пачынае актыўна супрацоўнічаць у якасці аўтара з віленскай беларускамоўнай газетай «Наша ніва».

У 1909 у Санкт-Пяцярбургу ў выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» выйшла першая яго кніга «Другое чытанне для дзяцей беларусаў».



У 1910 годзе ў Вільні выйшаў першы зборнік вершаў "Песьні-жальбы"(напісаны ў 1906—1909), затым - у 1912 выходзіць яго зборнік «Апавяданні», у 1914 -"Родныя з'явы".

У Пецярбургу ў 1913 г. асобнымі выданнямі выйшлі апавяданні «Тоўстае палена» і «Нёманаў дар», зборнік вершаваных апавяданняў «Прапаў чалавек». У савецкі час выдадзены кніга апавяданняў «Казкі жыцця» (1926, 1-е выданне - Коўна, 1921), зборнік вершаў «Водгулле» (1922).



Паэма «Новая зямля» (1923) -гэта таленавіты твор беларускай літаратуры, які па праву названы "энцыклапедыяй народнага жыцця", - помнік паэта сваім родным і блізкім, а таксама гімн і слава ўсяму беларускаму народу.

*Мой родны кут, як ты мне мілы!..*
*Забыць цябе не маю сілы!*
*Не раз, утомлены дарогай,*
*Жыццём вясны мае убогай,*
*К табе я ў думках залятаю*
*І там душою спачываю.*



Аповесць «У палескай глушы» (1923), зборнікі апавяданняў «Крок за крокам», «На рубяжы», «Першыя крокі», «У ціхай вадзе». У 1925 у часопісе «Полымя» апублікавана трэцяя рэдакцыя паэмы «Сымон-музыка». У гэтым творы асвятляецца роля мастака і мастацтва ў жыцці народа, тут найбольш поўна выявіліся эстэтычныя погляды Я. Коласа.


1

З. Сымона Музыкі

Блішчуць у бездані вячэрнія зоры,
Зямлю чуць ахве таемная ціша,
Імя тваё ў сэрцы мне думка напісала,
Імя тваё сцелюць мне тыя прасторы,
Дзе срэбраны серп аддае узвышша,
І вочы твае мне паказваюць зоры.

Калі ясным ранкам адвечнае сонца
Запаліць у росах мільёны вясёлак, —
Я чую твой голас у шолаху зёлак,
Я чую твой голас у спевах бясконцых
Травы прыбярэжнай, дзе месяца золак,
І ў смех твой ясны адвечнае сонцам

І пурпуровы вечар, і здзіўныя дзянніцы,
Прасторы надзем'я, руновыя далі, —
І ... кожным ... хвалі
Пакінуў мне вобраз твой след бліскавіцы,
З табою я ў шчасці, з табою і ў жалю,
Ты ... мне ... бліскаючы зарніцы.

Том Чацвёрты, Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Мінск, 1952 г.
„Сымон Музыка"
Стр. 423.

Якуб Колас

Аповесць «На прасторах жыцця» (1926, экранізавана ў 1929; уключаны і апавяданні, 2-е дапоўненае выданне ў 1928), аповесці «У глыбі Палесся» (1927), «Адшчапенец» (1932), «Дрыгва» (1934), зборнікі вершаў «Нашы дні» (1937),









«Адпомсцім» (1942), «Голас зямлі» (1943), паэмы «Суд у лесе» (Масква, 1943), «Адплата» (1946), зборнік вершаў «Мой дом» (1946), паэма «Рыбакова хата» (1947), трылогія «На ростанях» (1955, інсцэніравана пад назвай «Навальніца будзе» ў 1958; экранізавана ў 1960-1961 гг.), зборнік вершаў «Жыве між нас геній» (1952) і інш.






Аўтар твораў для дзяцей: паэмы «Міхасёвы прыгоды» (1935), вершаванай казкі «Рак-вусач» (1938), зборнікаў вершаў «На рэчцы зімой» (1941), «Вершы для дзяцей» (1945), зборнікаў апавяданняў «У старых дубах» (1941), «Раніца жыцця» (1950). Апрацаваў шэраг беларускіх народных казак.












Аўтар п'ес «Антось Лата» (1917, пастаўлена ў 20-х гадах), «Забастоўшчыкі» (1925), «Вайна вайне» (1927, канчатковая рэдакцыя ў 1938, пастаўлена ў 1937), «У пушчах Палесся» (1938, пастаўлена ў 1937), аднаактоўкі «На дарозе жыцця» (1917).

Выступаў у галіне публіцыстыкі і літаратурнай крытыкі.

У 1957 г. выйшаў зборнік «Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы». Выдаў падручнікі: «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (Пецярбург, 1909) і «Методыка роднае мовы» (1926).

Нясконачанай засталася паэма "На шляхах волі", распачатая ў 1926 г. Многія вершы Я. Коласа пакладзены на музыку.

Пераклаў на беларускую мову паэмы «Палтава» А. Пушкіна, паасобныя творы Т. Шаўчэнкі, П. Тычыны, А.Міцкевіча, Р.Тагора і інш. Быў адным з рэдактараў «Русско-белорусского словаря» (1953).



Выйшлі Зборы твораў у 7-мі (1952), 12-ці (1961-1964), 14-ці (1972-1978) тамах. Неаднаразова перавыдаваліся Выбраныя творы (апавяданні, вершы і паэмы).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946) за вершы ваеннага часу, Дзяржаўнай прэміі СССР (1949) за паэму «Рыбакова хата».

13 жніўня 1956 года сэрца паэта перастала біцца.









Імя Якуба Коласа, аднаго з найбуйнейшых песняроў сялянства, стваральніка вобразаў маляўнічых беларускіх краявідаў, самабытнага філосафа, надзвычай натуральна глядзіцца ў шэрагу імёнаў класікаў сусветнай літаратуры.



Інстытуту мовазнаўства Акадэміі навук прысвоена імя Якуба Коласа.

На адной з цэнтральных плошчаў сталіцы, што носіць яго імя, ўстаноўлены помнік песняру і яго героям.








Якуб Колас у майстэрні скульптара З.Азгура. 1949г.


ДВОРЕЦ СПОРТА







Сакрэт вечнай маладосці і творчай актуальнасці здзейсненага Янкам Купалам і Якубам Коласам у тым, што яны гарманічна і ўсебакова спалучылі ў сваёй літаратурнай дзейнасці індывідуальны пачатак і нацыянальныя вытокі, выявілі стыль мыслення, духоўнага жыцця, адносін паміж людзьмі, манеру побытавых паводзін і лад штодзённага існавання ў вялікім свеце.

У той жа час яны ўзвялі дасягнутае беларускім народам за стагоддзі свайго гістарычнага жыцця ў ступень з'явы сусветнага міжнароднага значэння і каштоўнасці.



Якуб Колас, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук, у сваім рабочым кабінеце. 1950г.

Веліч гэтых каласальных постацей у нашай культуры і літаратуры заключаецца ў тым, што яны нясуць народу і чалавецтву свежае гуманістычнае бачанне навакольнага свету, выказваюць свае ідэі і думкі з усёй страснасцю, уласцівай пракладальнікам новых шляхоў, і ў змаганні старога і новага заўсёды на баку новага, передавога, прагрэсіўнага.

Кожнае новае пакаленне беларусаў бачыць у феноменах творчасці вялікіх песняроў увасабленне сваіх надзей, мараў і ідэалаў, выяўленне самых яркіх і самых глыбокіх рыс нацыянальнага менталітэту, без чаго цяжка і немагчыма ўявіць саміх сябе, учарашніх, сённяшніх і будучых.

Памяць народных песняроў увекавечана ў памятніках і музеях.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

Смольня – гэта мемарыяльны комплекс народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Знаходзіцца ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці.

У жніўні 1912 г. тут адбылася першая сустрэча Я. Коласа і Я. Купалы.

# Спасибо за внимани